чынам, нягледзячы на патрабаванні інструкцыі міністэрства, выстаўка так і не трансфармавалася ў мясцовы прамысловы музей. Тым не менш яна падрыхтавала глебу для стварэння музеяў пры палатах дзяржаўных маёмасцей і статыстычных камітэтах, якія з'явіліся ў наступныя дзесяціголдзі і сталі першымі мясцовымі музеямі на тэрыторыі Беларусі.

1. *Киштымов, А. Л.* Беларусь на выставках XIX – начала XX в. / А. Л. Киштымов ; науч. ред. С. П. Витязь ; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исследований белорус. культуры, языка и литературы. – Минск : Беларус. навука, 2021. – 299 с.

2. *Михайловская, А. И.* Из истории промышленных выставок в России первой половины XIX в. / А. И. Михайловская // Очерки истории музейного дела в России. – М., 1961. – Вып. 3. – С. 79–154.

3. Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков : сб. док. и материалов / Рос. ин-т культурологии ; отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Этерна, 2010. – 957 с.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 197. Справа па цыркуляру МУС аб арганізацыі выставак узораў мясцовай прамысловасці.

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 9674. Справа ў адносінах МУС аб адкрыцці ў губернскіх гарадах выставак вырабаў прамысловасці і інш.

6. Описание Первой Публичной выставки российских мануфактурных изделий, бывшей в С.-Петербурге 1829 года. – Санкт-Петербург : тип. Экспедиции заготовления гос. бумаг, 1829. – [2], 323 с.

УДК 101.8:82-83Борхес

**В. М. Белакурскі,**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
**Ж. Я. Белакурская,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

## ХОРХЕ ЛУІС БОРХЕС: ФІЛАСОФСКІ ЎНІВЕРСУМ У БІБЛІЯТЭЧНЫМ КОСМАСЕ АРГЕНЦІНСКАГА ПІСЬМЕННІКА

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны аналізу шэрага філасофскіх аспектаў літаратурнай творчасці аргенцінскага пісьменніка XX ст. Хорхе Луіса Борхеса, цесна звязаных з яго светапоглядам. Прасочваецца станаўленне Борхеса-мысліцеля, вылучаючы перыяд яго дзяцінства і значную ролю бацькі-настаўніка ў азнаямленні сына з суб'ектыўна-ідэалістычнымі вучэннямі заходнееўрапейскіх філосафаў XVII–XIX стст. (Дж. Берклі, А. Шапенгаўэра), ідэі якіх істотна ўплывалі на філасофскае мысленне і літаратурную дзейнасць.

Засяроджваецца ўвага на тым, што засвоеныя філасофскія ідэі прыводзяць Борхеса да пераканання ў непасрэднай залежнасці самога аўтара мастацкага твора і навакольнага свету ад сілы мыслення суб'екта творчага працэсу.

У артыкуле вылучаны сэнсавобразы і метафары пісьменніка, напоўненыя значным філасофскім патэнцыялам, – Кніга, Бібліятэка, Лабірынт, Люстэрка і інш. Акцэнтуецца ўвага на тым, што філасофскім універсумам Борхеса-мысліцеля выступаюць тэксты.
Асобна разгледжаны рызаматычны падыход і прынцып мноства інтэрпрэтацый Борхеса, якія аказалі істотны ўплыў на фарміраванне адпаведных філасофскіх ідэй у культуры постмадэрну.
**Ключавыя словы:** Борхес, філасофскі ўніверсум, суб'ектыўны ідэалізм, бібліятэка, лабірынт, люстэрка, абстрактнае мысленне, мастацкая літаратура, творчасць, постмадэрнізм, рызома, прынцып мноства інтэрпрэтацый.

**V. Belakurski,**
*PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social Disciplines of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*
**Z. Belakurskaya,**
*PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communications of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## JORGE LUIS BORGEZ: PHILASOPHICAL UNIVERSUM IN THE BIBLIARICAL SPACE OF ARGENTINA WRITER

**Abstract.** The article highlights the analysis of the philosophical aspects of the literary creativity of the Argentine writer of the 20th century. Jorge Luis Borges, closely associated with the world's views. The author explores the process of becoming Borges as a thinker, the early stages of his dynasty and the important role of his father-mentor at that time, a well-known son from his idealistic studies. and Western European philosophies of the 17th – 19th centuries. (J. Berkeley, A. Schapengauer), the ideas for all creative work flowed from the philosophical mentality and literary zineness of the writer.
The attention is focused on the fact that the adopted philosophical ideas of Borges and the work of the creative process itself are carried out in the same way.
The article contains the most expressive images and metaphares of the writer, filled with significant philosophical patents – Book. Library. Labyrinth. Mirror and others. The emphasis is on the fact that the texts represent the philosophical universes of Borges the thinker.
The author separately examines the rhizomatic approach and the principle of many interpretations of Borges, which have had a significant influence on the formation of current philosophical ideas in postmodern culture.
**Keywords:** Borges, philosophical universe, subjective idealism, literature, labyrinth, luster, abstract mentality, artistic literature, creativity, pastmadernism, rhizoma, principle of the multitude awesome.

Аргенцінскі пісьменнік Хорхе Луіс Борхес (1899–1986) заявіў аб сабе ў літаратуры XX ст. не толькі творчай непаўторнасцю, але і філасофскай глыбінёй твораў, парадаксальным чынам разгарнуўшы шэраг сур'ёзных праблем гістарычнага, культуралагічнага і агульначала-

вечага зместу. Заўчасная хвароба органаў зроку, які ён канчаткова страціў у 40-я гг., стварыла своеасаблівыя ўмовы ўзаемадзеяння мысліцеля з навакольным светам. Цемра сур'ёзна абмежавала пачуццёвы характар творчасці, разам з тым абвастрыла імкненне да абстрактнага мыслення і асэнсавання менавіта на гэтым падмурку міфалагічных, рэлігійных, навуковых, мастацкіх і іншых вобразаў і паняццяў.

Адзначым, што ў дзяцінстве моцны ўплыў на фарміраванне светапогляду сына аказаў бацька, а таксама багатая бібліятэка ў родным доме. Пазней Борхес з удзячнасцю прызнаваў: «Калі б мяне спыталі пра галоўную падзею ў маім жыцці, я б назваў бібліятэку майго бацькі» [3, с. 560]. Менавіта бацька пазнаёміў школьніка Луіса з заходнееўрапейскімі філосафамі XVII–XIX стст., акцэнтуючы ўвагу на ідэях англійскіх і нямецкіх суб'ектыўных ідэалістаў, асабліва Джорджа Берклі («Свет – комплекс маіх уяўленняў») і Артура Шапенгаўэра («Свет – гэта воля і нашы ўяўленні»). Знаёмства з філасофіяй суб'ектыўнага ідэалізму фарміравала імкненне юнака адносіцца да рэальнага свету, як да сну альбо вымыслу, сціраючы межы паміж рэальнасцю і мроямі. Гэта ідэя пазней знойдзе ўвасабленне ў творах аўтара, адзін з якіх быў прысвечаны старажытнаму кітайскаму філосафу Чжуан-Цы. Адпаведна сюжэту, абуджаны, той ніяк не змог сабе ўцяміць, хто ён – чалавек, якому прыснілася, што ён матыль, ці наадварот – матыль, які ўбачыў у сваіх снах, што ён чалавек?

Пад уплывам філасофіі суб'ектыўнага ідэалізму Борхес прыходзіць да пераканання аб непасрэднай залежнасці аўтара мастацкага твора і навакольнага свету ад фарміруючай сілы свядомасці. У вершах і эсэ ён дэманструе розныя, але ўдалыя ўзоры рэалізацыі творчых намаганняў у дадзеным напрамку. Пераканаўчым і выразным сведчаннем гэтага ў Борхеса выступаюць арыгінальныя і глыбокія па філасофскаму зместу шматлікія вобразы-сімвалы, асобнае месца сярод іх займаюць Кніга, Бібліятэка, Лабірынт, Люстэрка і інш. «Пазнанне сусвету, культуры і чалавека Борхес ажыццяўляе праз сімвалічнае і сэнсавае выражэнне, выкарыстоўваючы метафары, якія выступаюць у яго мадэлі культуры шматгранным эпістэмалагічным сродкам» [4, с. 16].

Борхес не адносіў сябе да акадэмічных філосафаў. Яго своеасаблівым філасофскім універсумам выступаюць кніжныя тэксты. Паводле аўтара, усе яны вядуць да адзінай і абсалютнай Кнігі-Субстанцыі як першапрычыны, у якую адзін за адным паступова ўліваюцца, складаючы яе цэлае. Паасобку кожны з тэкстаў уяўляе толькі акцыдэнцыю – нешта часовае і зменлівае. Згодна Борхесу, «мы радкі, словы, нават літары магічнай кнігі, і гэта кніга, якая знаходзіцца ў стане вечнага напісання, – адзінае, што ёсць у свеце, больш правільна, яна і ёсць свет» [2, с. 428]. Такім чынам, іерархічнай падпарадкаванасці свету Борхес супрацьпаставіў рызаматычны падыход, уласцівы пазней культуры постмадэрну. Да фарміравання апошняй Борхес будзе мець непа-

срэднае дачыненне сваімі творчымі намаганнямі, а таксама тымі навацыямі, якія ўвойдуць у яе арсенал. Даволі выразна ў мастацкіх творах Борхеса прабіваўся і будучы постмадэрнісцкі прынцып – прынцып мноства інтэрпрэтацый. Борхес лічыў, што бясконцасць праяў свету мае сваім лагічным і натуральным вынікам бясконцую колькасць яго інтэрпрэтацый у тэкстах. Прыклад фантастычнай Бібліятэкі мысліцеля, у якой адна кніга «ўтрымлівае сэнс і кароткае апісанне ўсіх іншых», паўстае своеасаблівай рызомай сэнсаў, дзе існуе мноства твораў розных аўтараў побач з яшчэ большым мноствам прысвечаных ім тэкстаў-інтэрпрэтацый іншых творцаў, іх сучаснікаў, а таксама аўтараў больш позніх часоў і гэтак далей, якія так ці інакш звязаны ў гэтым складаным лабірынце пошукам адзінага ў свеце шматлікага.

Падкрэслім, што тэма рызаморфнага лабірынта паўстае адной са значных у творчасці пісьменніка. Рызома сімвалізуе адсутнасць іерархічнай падпарадкаванасці, а таксама прадказальнасці ва ўніверсуме Борхеса, дзе немагчыма знайсці адназначныя сувязі, якія б паўтараліся і тым самым сведчылі аб наяўнасці трывалых законаў. Акрамя гэтага, рызома накіроўвае разважлівага суб'екта на думку аб складанасці і шматграннасці свядомасці, паколькі кожны суб'ект адметны ўнікальным, непаўторным перапляценнем сваіх думак, пачуццяў, успамінаў і інш. Адсюль Борхес імкнецца падвесці чытача да суб'ектыўна-ідэалістычнай высновы – рэчаіснасць на самай справе ні што іншае, як наша ўяўленне аб ёй. «Асмелюся сцвярджаць, – падкрэслівае аўтар, – што рысы Сусвету можна пазнаць толькі ў той узгодненасці, якую сфармуляваў Шапенгаўэр» [1, с. 190].

Такім чынам, вобраз адзінства ў касмічнай цемры нябачных прадметаў і з'яў Борхес шукаў, абапіраючыся на філасофію. Яму яна стала «мовай агульных паняццяў», з якіх аргенцінец парадаксальна канструяваў свой непаўторны суб'ектыўны сусвет, той, што адначасова выклікае і здзіўленне і захапленне ўдумлівага чытача.

1. *Борхес, Х. Л.* Собрание сочинений : в 4 т. / Х. Л. Борхес. – СПб. : Амфора, 2011. – Т. 1. – 590 с.

2. *Борхес, Х. Л.* Собрание сочинений : в 4 т. / Х. Л. Борхес. – СПб. : Амфора, 2011. – Т. 2. – 484 с.

3. *Борхес, Х. Л.* Собрание сочинений : в 4 т. / Х. Л. Борхес. – СПб. : Амфора, 2011. – Т. 3. – 703 с.

4. *Чистюхина, О. П.* Борхес / О. П. Чистюхина. – Ростов н/Д : ИКЦ «МарТ», 2005. – 112 с.